***850-годдзю Чачэрска***
*прысвячаецца*

# *СПАТКАННЕ З ПОЎНЯЙ*

*Вершы*

ААТ «Полеспечать»
Гомель • 2009

## МАЯ ЗЯМЛЯ

*Жыхар бязмежнага Сусвету*
*З прапіскай даўняй на Зямлі,*
*Мне выбраў лёс планету гэту,*
*Дзе продкі ўсе мае жылі.*

*Між зор касмічнае прасторы*
*Ляцяць Сатурн, Венера, Марс...*
*І ўсё ж Зямлі радней уборы,*
*Яна – выток і спраў, і мар.*

*Яна – прыгожая адвечна,*
*Яна – любімая найбольш,*
*Ці спека дзённая, ці вечар,*
*Ці холаду гуляе золь.*

*Ёй так да твару колер кветак,*
*Блакіт азёр, калоссе ніў,*
*Снягі зімой і дожджык летам,*
*У гмахах яркія агні.*

*Кружляе ў космасе планета,*
*А з ёй Чачэрск мой, сіні Сож.*
*І гэты сонцам свет сагрэты,*
*Крывавы Марс, не патрывож!*

*25.11.2008*



# I

***

**Р**адзінны кут не выбіраюць.
Дзе свет убачыць немаўля,
Там стане блізкаю зямля,
Бліжэй, мілей, чым шаты раю.

*10.09.2007*



## КРАЙ ДАРАГІ

**Ч**ачора, Сож, Каўпіта, Покаць, –
Люблю я рэк адвечны бег,
Дзе веснім днём жаўцее лотаць,
Дзяцей звініць улетку смех.
У краі тым – зялёным, ціхім –
І я зрабіў свой першы крок,
Калі вайны гуляла ліха,
Мяняў жыццё на смерць курок.
Трывалі горад, вёскі, людзі,
Зямлю баронячы тады.
...Расправіў край шырока грудзі,
Квітнее садам маладым.

*04.12.2006*

## ВЫТОК

**А**бсягі чачэрскага краю
Прапісаны ў сэрцы маім.
Бы птушка, сюды прылятаю
Ці холад, ці спёка стаіць.

Завуць Балсуны і Палессе* –
Жыццёвай дарогі выток,
Люляла тут сны мае песня –
Пяшчоты душэўнай глыток.

...Сцяжынка знаёмая ўецца.
Трава зноў у пацерках рос.
Нястрымана просіцца сэрца
У цішу бялюткіх бяроз.

Сустрэне грыбамі Лысуха,**
Сухі – вось дык назва! – Ручэй**.
Мелодыі лесу паслухай –
Самоту прагоніш хутчэй.

**Балсуны, Палессе – вёскі.*
***Лысуха, Сухі Ручэй – назвы ўрочышчаў.*



Са сцежкі на ягаднік збочу –
Асінка лістотай махне.
Чарніц цёмна-сінія вочы
Спакусна зірнуць на мяне.

Дзяцінства ўспомніцца раптам, –
Не вернеш вясёлай пары, –
Лес клікаў нас ліпеньскім ранкам:
Гарлачык для ягад бяры.

Чародкай сяброўскай хадзілі,
Дужэла моц нашае крыл.
І разам з малою радзімай
Вялікую тут я адкрыў.

*07.08.2007*

## ЧАЧЭРСК

Добры дзень, поле з коласам
жытнім,
Мяккі водар бухматых садоў,
Мой зялёны такі, старажытны
На прырэчнай зямлі гарадок!
Фарбай светлай абноўленых
вуліц
Ззяе, вабіць Чачэрск – прыгажун.
Парк гасцінна мяне зноўку
туліць,
На Чачору ўлюблёна гляджу.
Позірк ловіць лугі, азярыны.
Сіняй стужкай віднеецца плёс.
Праплываюць аблокаў пярыны
У блакіце высокім нябёс.
Хваляй Сожа бягуць успаміны.
Зноў гукаю сваю маладосць.
Дзякуй, родны Чачэрск,
сэрцу мілы,
Што заўсёды ў жыцці маім ёсць!

*06.01.2008*



## ЖЫВУ РАДЗІМАЙ

Папракаюць мяне:
“Зноў твой верш пра Чачэрск,
Бы балота кулік
Хваліш ціхі свой кут”...
Я ж інакш не магу:
Сож праз сэрца цячэ,
Нібы брату, я рад
З тых мясцін земляку.

Там лазняк над ракой
Салаўямі пяе.
Беланогіх бяроз
Сарамлівы пагляд, –
Мне для шчасця ў жыцці
Часта іх не стае,
Як і цвету, якім
Май адорвае сад.

А як песні жанчын
Там палоняць душу,
Жаўруковым званком
Па-над краем плывуць!..

...Я адпрэчыў папрок,
Пра Чачэрск зноў пішу,
Бо радзімай малой
Бы паветрам жыву.

*20.07.2006*



## РОДНЫЯ НАЗВЫ

Ці вёска гэта, ці рачулка –
Іх назвы музыкай гучаць,
Кранае слоўца нас прачула,
Бы спеў салоўкі па начах.

Палессе, Ніўкі і Залессе,
Заручча, Добрынь і Гаёк*,
Гучыць у назвах гэтых песня,
Што чую сэрцам я здалёк.

Мне вёскі гэтыя бы сёстры,
Па духу блізкая радня.
Праз годы доўгія і вёрсты
Іх лёс у памяці штодня.

Бягуць удалеч там жа рэкі,
Дзе ў радасць хо́дзім басанож.
Нібы магнітам цягне нейкім
Мяне блакітны плыткі Сож.

---

** Палессе ... Гаёк – назвы вёсак на Чачэршчыне.*

Вясной з гарэзаю Чачорай*
Абдымуць дружна бліжні луг.
Паводка, нібы тое мора,
Прывольна плешчацца наўкруг.

Віляе вузкім шнурам Покаць*,
У травах мяккіх берагі,
Як май на іх рассыпле лотаць –
Сплыве адразу цень тугі.

Каўпіта* – значыць, белы жораў, –
У Бесядзь ціхую цячэ.
У вір ныраюць смела зоры,
Калі гусцее туш начэй.

Наш продак быў, відаць, паэтам,
І спраў, і слоў красу цаніў.
І нам любіць бы край вось гэтак,
Быць каласком на ўлонні ніў!

*13.09.2008*

---

** Чачора, Покаць, Каўпіта – назвы рэк там жа.*



## АТОЖЫЛКІ СЛАВЯНСКАГА КАМЛЯ

Крочу зноўку вуліцай Палесся.
Побач рэчка стужкаю бяжыць.
Тут на тры раёны льецца песня,
Бо яна не ведае мяжы.

Мкне на захад цераз лес і поле,
Дзе агні чачэрскія гараць.
Курс бярэ на поўнач – Краснаполле,
На ўсход – там Красная Гара.

Парадніла Беларусь з Расіяй
Нашых продкаў светлая зямля.
Мы ж атожылкі пад небам сінім
З аднаго, славянскага камля.

У баях былі заўсёды разам.
Дружбе нашай – доўгія вякі.
І цяпла душэўнага запасы
Як сухар, дзялілі сябрукі.

Разгубіць пачуцці немагчыма,
Як не выпіць месяцу расу.

Я праз мытню ад сваёй Айчыны
Расіянам дружбу пранясу.

Як для птушак, так для сэрцаў
нашых
Нельга ўзвесці аніяк кардон.
Толькі разам мы вузлы
развяжам,
Справімся з усякаю
бядой.

*14.01.2008*



## ЧАЧЭРСКАЯ ЎРАЧЫСТАЯ

Памяць і сэрца не здрадзяць ніколі
Роднай, як маці, чачэрскай зямлі.
Марылі продкі пра шчасную долю –
З цемры да сонца мы выйсці змаглі.

*ПРЫПЕЎ*:

Хвалі Чачоры, блакітнага Сожа
Гойдаюць веліч ажыўшых надзей.
Нашы абсягі квітнеюць прыгожа –
Працу шануем, зямлю і людзей.

Ратушы вежы і бор ля Палесся*,
Помнікі мужнасці, колас тугі,
Танец задорны, народная песня
Славяць сягоння наш край дарагі.

*ПРЫПЕЎ.*

Верныя дружбе народаў-суседзяў –
Сэрцы ніяк не прызналі мяжы –

* *Палессе – вёска.*

Мы расіян, украінцаў прывецім,
Знаем і самі цяпло іх душы.

*ПРЫПЕЎ.*

Клічуць наперад крылатыя мары,
Сонечным бачыцца заўтрашні дзень.
Светлыя ўнукам пакінем абшары –
Цвёрды наш поступ у рупнай хадзе.

*ПРЫПЕЎ.*

*14.04.2009*



## Я ПРАГНА П'Ю...

**Я** прагна п'ю жыцця імгненні,
Хоць розны іх бывае смак.
Яны – выток майго натхнення,
Сардэчнай шчырасці размах.

Лячу тады, нібы на крылах,
І грэе ўсё маю душу,
Сябе напоўню новай сілай –
На свет па-іншаму гляджу.

Бывае ж, сум агорне сэрца,
Тады спяшаю да людзей,
Ля іх прыемна адагрэцца,
Каб зноў зацвіў звычайны дзень.

...Ці промні тчэ даўгія сонца,
Ці зноў бубніць цыбаты дождж, –
Жыццё люблю, люблю бясконца,
Дзе ёсць сябры і ціхі Сож.

*07.08.2006*

## ЧАЧЭРСКІ НАБОЖНІК

На кроснах вытканы набожнік –
Мастацтва даўняга ўзор,
Дзе барвай ззяе ромбік кожны,
Крыжы, палоскі, россып зор.

Мільгаў чаўнок тады з утокам
У спрытных вопытных руках.
Узоры тыя вабяць вока,
Народ стагоддзі іх шукаў.

Займаў ручнік у хаце покуць,
Святло высвечваў кожны штрых.
...Палессе, Рудня, Отар, Покаць, –
Усюды спадчына майстрых.

*23.07.2006*



## ПРЫСТАНЬ КРЭМЕНЬ

Прыстань Крэмень, прыстань Крэмень...
Баржы з грузам... Параход...
Спраў па горла кожнай змене,
Льецца з твараў густа пот.

Ные стужка транспарцёра,
Дошкі скодкаў – хадуном...
Труцень дасць адразу дзёру –
Прыстань вам не цёплы дом.

Соль, пясок, мяхі з мукою,
Зерне з баржаў даставай.
Сож не ведае спакою,
Рана, братка, уставай.

Ганнапольскія падлеткі
Дзень цалюткі ля ракі,
Зарабляюць грошы ўлетку,
Рыбу вудзіць мастакі.

Дэбаркадэр як аблепяць –
Смех звініць тут без канца.

Ды няма на свеце лепей –
Даць ля прыстані нырца.

Так было, было такое...
Прыстань сцішана стаіць,
Толькі рэха векавое
Дзесьці шастае ў гаі.

*20.08.2007*



## ВЯЧЭРНЯЯ КАЎПІТА

**С**цішэла,
бы стамілася Каўпіта.
Паўсюль на бераг
выбеглі кусты,
Іх голле хмелем
ад зямлі спавіта.
Туман на лузе пасвіцца
густы
На тым жа прыбярэжным,
вечаровым,
Дзе з бацькам травы
я любіў касіць,
Дзе маладзік сярэбранай
падковай
Над плёсам рэчкі
ноч усю вісіць.
Купаюцца ў вірку
азартна зоры.
Гарлачык на затоцы ціхай
спіць.
І толькі недзе ля кустоў
да зморы,

Згубіўшы голас,
зноў дзяркач скрыпіць.
З дзяцінства родныя
пейзажы, гукі,
Мая калыска цёплае
ракі...
Знаёмы вір зноў спрытна
рэжуць рукі –
Што лепей можа быць
хвілін такіх?!

*15.01.2008*



## ПОМНЯЦЬ СЦЭНЫ...

*Залескаму народнаму хору Чачэрскага раёна*

Вёска прапісалася на ўзлессі,
Дзе азёраў сподкі і гаі.
У Залессі так співаюць песні,
Што зайздросцяць нават салаўі.

Хор славуты памятаюць сцэны,
Шчырых, галасістых Еўдакій,
Талент іх ад Бога, неацэнны,
Дзе шчэ стрэнеш весялух такіх!

Песні тыя – душ людскіх крыніца,
Дзе струменяць чыстыя ключы.
Іх паслухаць – мудрасці напіцца,
Радасцю самоту палячыць.

Веру: не заціхне вёскі голас,
Дзе шуміць паводкаю вада,
Поле росціць ураджайны колас,
Свеціцца наземная "Звязда"*.

*17.11.2006*

* *"Звязда" – назва гаспадаркі.*

## БАЦЬКАВА ХАТА

Дарога да вёскі –
Лінейка прамая.
Рачулка, палянка
І тыя ж лугі,
Ды хата без мамы –
Нязвыкла нямая,
Без голасу бацькі –
Падворак глухі.

Прапісаны ціша,
Быльнёг каля плоту.
І двор затравелы
Самотай прапах,
Снягі засыпаюць
І сушыць спякота,
І вецер сваволіць
Вакол па начах.

Настрой не падыме
І градус кілішка,
Вось зноўку слязіну
Стрымаць я не змог.



Як многа аддаў бы
За матчына:"Мішка!",
Калі я вяртаўся
На родны парог.

Прыпомніш дзяцінства.
За вёскай клін руні.
З таптухай рыбалку,
З гнілушак бліны…
Прадаць усё можна:
І хату, і пуню.
Любоў да Радзімы
Не мае цаны!

*23.12.2007*

## БЕЖАНЦЫ

Развяжу вузельчык успамінаў,
І радок з-пад ручкі пацячэ.
Словам першым быў
не «хлеб», а «міна»,
І цяпер агнём яно пячэ.
Громам невыносна грукатала,
Па зямлі кацілася бяда.
Пырскамі гарачага металу
Закіпалі неба і вада.
... – Мам, глядзі,
Вунь свінні ў самалёце, –
Мам, паслухай, як яны вішчаць, –
Хлапчуку ішоў чацвёрты годзік...
– Гэта ж бомбы! – бежанцы крычаць.
І барвелі ад пажараў далі,
Дым цягнуўся едкі і густы.
Бежанцы ад злыдняў уцякалі,
Ратавалі пушчы і кусты.
Лес спяваў дзятве ўсей калыханку,
Хоць стагнаў ад выбухаў, трывог.
Трасы куль – смяротныя маланкі –
Прашывалі буданы і мох.



...Схоў надзейны – родная зямліца
Ды шатры зялёныя кустоў,
Я сыноў прывёў вам пакланіцца,
Адпачыць у засені густой.

*06.01.2008*